**ВОДЗЫЎ**
**на аўтарэферат дысертацыі Марыны Сяргееўны Захаравай**
**“Полифункциональность эпиграфа в белорусских и англоязычных коротких рассказах”, прадстаўленай на атрыманне вучонай ступені кандыдата філалагічных навук па спецыяльнасцях 10.01.01 – беларуская літаратура, 10.01.08 – тэорыя літаратуры. Тэксталогія**

Падыходы да аналізу мастацкага тэксту, якія грунтуюцца на канцэпцыі М. М. Бахціна і створанай на яе аснове тэорыі інтэртэкстуальнасці Ю. Крысцевай, атрымалі шырокую рэалізацыю ў айчынным літаратуразнаўстве (працы Г. Я. Адамовіч, А. Г. Таразевіч, Н. М. Базар і інш.). Дысертацыя М. С. Захаравай таксама палягае ў гэтай сферы: саіскальніца вучонай ступені кандыдата навук абапіраецца на вопыт папярэднікаў, аднак не абірае для даследавання ўвесь складаны комплекс інтэртэкстуальных элементаў, а засяроджваецца на адным з іх. Ужо ў самім выбары аб’екта (эпіграф) і прадмета даследавання (функцыянальныя характарыстыкі эпіграфа ў беларускім і англамоўным апавяданні) бачыцца навуковая навізна работы.

Арыгінальнай і новай выглядае распрацаваная М. С. Захаравай трохступенчатая схема аналізу эпіграфа з улікам поліфункцыянальнасці яго прыкмет – вылучаны і ўсебакова ахарактарызаваны міжсуб’ектныя, унутрытэкставыя і пазатэкставыя функцыі.

Старонкі аўтарэферата, суадносныя з главамі дысертацыі, на першы погляд падаюцца стракатымі і перагружанымі ілюстрацыямі: прыводзяцца эпіграфы на беларускай і англійскай мовах, прапануецца пераклад апошніх на рускую. Думаецца, у аўтарэфераце варта было б больш увагі надаць канстатацыі тэарэтычных палажэнняў, універсальных высноў і мінімізаваць канкрэтныя прыклады, разбор прыватных тэкстаў.

Разам з тым ілюстрацыі раскрываюць механізм рэалізацыі той ці іншай функцыі эпіграфа. Акрамя таго, падобная канкрэтыка выяўляе здольнасць дысертанткі бачыць мастацкі тэкст, адчуваць яго ідэйна-семантычныя нюансы, распазнаваць не заўсёды відавочную аўтарскую інтэнцыю, заўважаць і граматна інтэрпрэтаваць выкарыстанне разнастайных сродкаў мастацкай выразнасці.

Як відаць з аўтарэферата, М. С. Захарава добра валодае метадалагічным інструментарыем літаратуразнаўчага даследавання і ўмее прымяняць яго пры аналізе мастацкага матэрыялу. Усяго дысертанка прааналізавала творы 58 аўтараў (162 эпіграфы), дзе ў парытэтных прапорцыях прадстаўлены эпіграфы да беларускіх і англамоўных тэкстаў (83 і 79 адпаведна). Рэпрэзентатыўнасць фактычнага матэрыялу дазваляе

меркаваць пра пераканаўчасць і доказнасць высноў, дакладнасць вынікаў праведзенага даследавання.

Варта адзначыць высокую ступень апублікаванасці навуковых назіранняў М. С. Захаравай: спіс публікацый саіскальніцы ўключае 25 пазіцый, прычым 8 артыкулаў змешчаны ў часопісах, рэкамендаваных ВАК Рэспублікі Беларусь. Аналіз публікацый паказвае, што ў іх усебакова прадстаўлены асноўныя палажэнні дысертацыі, якія выносяцца на абарону.

Такім чынам, аўтарэферат дае падставы лічыць, што дысертацыя “Полифункциональность эпиграфа в белорусских и англоязычных коротких рассказах” з’яўляецца завершанай, самастойна выкананай кваліфікацыйнай навуковай работай, а яе аўтар М. С. Захарава вартая прысуджэння вучонай ступені кандыдата філалагічных навук па спецыяльнасцях 10.01.01 – беларуская літаратура, 10.01.08 – тэорыя літаратуры. Тэксталогія.

Кандыдат філалагічных навук,
дацэнт, дацэнт кафедры
беларускай і замежнай літаратуры
УА “Беларускі дзяржаўны
педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка” [signature] Н. В. Заяц

МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
УСТАНОВА АДУКАЦЫІ «БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ПЕДАГАГІЧНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ ІМЯ МАКСІМА ТАНКА»

Подпіс Заяц Н.В.
[signature] начальника ОК БГПУ
С. Б. Мисуенко
02 2023 г.

Водзыў паступіў у савет па абароне дысертацый Д.01.42.04
03.03.2023 г. сакратар савета [signature] (Богдан А.Ї.)

Я, Заяц Наталля Віктараўна, кандыдат філалагічных навук, дацэнт, дацэнт кафедры беларускай і замежнай літаратуры УА “Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка”, даю дазвол на публікацыю майго водзыву на аўтарэферат дысертацыі Марыны Сяргееўны Захаравай на сайце ДНУ “Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі”.

28.02.2023 Н.В.Заяц

Установа адукацыі "Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка" ФІЛАЛАГІЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ

С отзывом ознакомлена

16.03.2023 /М.С. Захарова/